ЗАЦВЕРДЖАНА
Пастанова
Міністэрства адукацыі
Рэспублікі Беларусь
10.06.2025 № 103

# Вучэбная праграма
## па вучэбным прадмеце «Беларуская мова» для III–IV класаў устаноў адукацыі, якія рэалізуюць адукацыйныя праграмы агульнай сярэдняй адукацыі, з беларускай і рускай мовамі навучання і выхавання

# ГЛАВА 1
# АГУЛЬНЫЯ ПАЛАЖЭННІ

1. Дадзеная вучэбная праграма па вучэбным прадмеце «Беларуская мова» (далей – вучэбная праграма) прызначана для III–IV класаў устаноў адукацыі, якія рэалізуюць адукацыйныя праграмы агульнай сярэдняй адукацыі, з беларускай і рускай мовамі навучання і выхавання.

2. Дадзеная вучэбная праграма разлічана на 174 гадзіны: па 87 гадзін у III і IV класах (3 гадзіны на тыдзень у першым паўгоддзі і 2 гадзіны на тыдзень у другім паўгоддзі ва ўстановах адукацыі з беларускай мовай навучання і выхавання; 2 гадзіны на тыдзень у першым паўгоддзі і 3 гадзіны на тыдзень у другім паўгоддзі ва ўстановах адукацыі з рускай мовай навучання і выхавання).

3. Мэта навучання беларускай мове – авалоданне навучэнцамі камунікатыўнымі ўменнямі і навыкамі, неабходнымі для эфектыўнага выкарыстання мовы ў розных сітуацыях зносін, развіццё іх творчага патэнцыялу, далучэнне праз мову да культурных традыцый беларускага народа.

4. Асноўнымі задачамі навучання беларускай мове выступаюць:

4.1. у межах фарміравання моўнай кампетэнцыі:

асэнсаванне тэксту, сказа, слова і гука з пункту гледжання іх функцыянавання;

авалоданне графікай беларускай мовы;

засваенне фанетычных, лексічных і граматычных ведаў для іх прымянення ў маўленчай дзейнасці;

узбагачэнне слоўнікавага запасу навучэнцаў, засваенне вымаўленчых нормаў, правілаў правапісу;

4.2. у межах фарміравання маўленча-камунікатыўнай кампетэнцыі:

развіццё камунікатыўных уменняў і навыкаў навучэнцаў;

развіццё практычных уменняў і навыкаў выкарыстання беларускай мовы ва ўсіх відах маўленчай дзейнасці;

развіццё творчых здольнасцей навучэнцаў пры стварэнні ўласных вусных і пісьмовых выказванняў;

4.3. у межах фарміравання лінгвакультуралагічнай і сацыякультурнай кампетэнцый:

развіццё пачуццёва-вобразнага ўспрымання беларускай мовы і ўмення адрозніваць яе ад рускай мовы;

асэнсаванне беларускай мовы як нацыянальнай культурнай каштоўнасці;

развіццё асэнсаванага ўспрымання беларускай літаратурнай мовы як сродку замацавання культурных традыцый, маральных каштоўнасцей грамадства;

засваенне правілаў маўленчага этыкету, сацыяльных норм маўленчых паводзін у розных сітуацыях зносін;

развіццё ў навучэнцаў пачуцця прыгажосці, мілагучнасці, выразнасці, эстэтычнай вартасці беларускай мовы.

5. Формы і метады навучання і выхавання.

Асноўнай формай правядзення вучэбных заняткаў па вучэбным прадмеце «Беларуская мова» з'яўляецца ўрок. Для ўрока беларускай мовы характэрна перавага калектыўных формаў арганізацыі вучэбнай дзейнасці навучэнцаў у спалучэнні з рознымі формамі дыферэнцыяцыі і індывідуалізацыі адукацыйнага працэсу. У залежнасці ад задач кожнага этапу ўрока выкарыстоўваецца калектыўная, групавая або індывідуальная форма працы навучэнцаў, разгортваецца агульнакласная, міжгрупавая або ўнутрыгрупавая вучэбная дыскусія.

Змест вучэбнага прадмета «Беларуская мова» прадугледжвае выкарыстанне дзейнасных метадаў навучання, у тым ліку адкрыццё пад кіраўніцтвам педагагічнага работніка элементарных моўных з'яў, заканамернасцяў.

У працэсе навучання беларускай мове рэкамендавана рацыянальнае спалучэнне разнастайных метадаў навучання: тлумачальна-ілюстрацыйнага (інфармацыйна-рэцэптыўнага), рэпрадуктыўнага, праблемнага, часткова-пошукавага (эўрыстычнага).

Выбар формаў і метадаў навучання і выхавання вызначаецца педагагічным работнікам самастойна на аснове мэт і задач вывучэння канкрэтнай вучэбнай тэмы, патрабаванняў да вынікаў вучэбнай дзейнасці навучэнцаў, якія сфармуляваны ў главах 2–3 дадзенай вучэбнай праграмы.

Урок любога тыпу можа быць праведзены з выкарыстаннем электронных сродкаў навучання.

6. Навучанне беларускай мове на I ступені агульнай сярэдняй адукацыі накіравана на дасягненне навучэнцамі асобасных, метапрадметных і прадметных вынікаў:

6.1. асобасныя: усведамленне навучэнцамі прыналежнасці да беларускага народа, цікавасць да вывучэння беларускай мовы, сфарміраванасць асобаснага сэнсу яе вывучэння і каштоўнасных адносін да яе; імкненне авалодаць беларускай мовай як сродкам зносін, які дазваляе выражаць свае думкі ў вуснай і пісьмовай форме;

6.2. метапрадметныя: уменне ўспрымаць і асэнсоўваць вучэбны матэрыял, які прад'яўляецца ў вербальнай форме, вылучаць галоўнае ў ім, рацыянальна запамінаць, выконваць разумовыя аперацыі; уменне

выкарыстоўваць маўленчыя сродкі і сродкі інфармацыйна-камунікацыйных тэхналогій для рашэння камунікатыўных і пазнавальных задач; уменне працаваць з вучэбнай кнігай, іншымі друкаванымі і аўдыявізуальнымі крыніцамі інфармацыі; уменне працаваць з інфармацыяй (пошук, прымяненне, захаванне), рыхтаваць сваё выступленне і выступаць з аўдыя-, відэа- і графічным суправаджэннем; уменне слухаць суразмоўцу і весці дыялог, прызнаваць наяўнасць розных пунктаў гледжання, выказваць сваё меркаванне і аргументаваць яго;

6.3. прадметныя: валоданне першапачатковымі ўяўленнямі пра беларускую мову як адну з дзяржаўных моў у Рэспубліцы Беларусь; валоданне графічнымі і каліграфічнымі навыкамі; валоданне вывучанымі нормамі беларускай мовы (арфаэпічнымі, арфаграфічнымі, лексічнымі, граматычнымі), імкненне да захавання іх у маўленні; прымяненне ведаў пра якасці і функцыі моўных адзінак для рашэння вучэбных задач; выкарыстанне сфарміраваных моўных і маўленчых уменняў і навыкаў для ажыццяўлення маўленчай дзейнасці; выкарыстанне беларускай мовы ў працэсе зносін; валоданне правіламі беларускага маўленчага этыкету, захаванне культуры маўленчых паводзін.

7. Змест вучэбнага прадмета адабраны з улікам рэалізацыі наступных напрамкаў у працэсе развіцця асобы навучэнца: моўнага (засваенне сістэмы мовы, заканамернасцей і правілаў функцыянавання моўных сродкаў у маўленні, норм беларускай літаратурнай мовы), маўленчага (авалоданне спосабамі перадачы думкі сродкамі мовы ў вуснай і пісьмовай формах, у розных відах маўленчай дзейнасці: чытанні, слуханні, гаварэнні, пісьме), камунікатыўнага (авалоданне культурай маўлення, правіламі маўленчых зносін, уменнямі ствараць самастойныя вусныя і пісьмовыя выказванні розных відаў), лінгвакультуралагічнага (асэнсаванне беларускай мовы як нацыянальнай каштоўнасці, сродку замацавання культурных традыцый, засваенне нацыянальна маркіраваных адзінак беларускай мовы), сацыякультурнага (засваенне сацыяльных норм маўленчых паводзін, культурных каштоўнасцей беларускага народа і агульначалавечых каштоўнасцей, авалоданне правіламі беларускага маўленчага этыкету).

Змест вучэбнага прадмета «Беларуская мова» складаюць:

моўныя веды, уменні і навыкі (веды аб сістэме моўных адзінак і заканамернасцях іх функцыянавання, моўных нормах і міжмоўнай аманіміі, фанетыка-артыкуляцыйныя навыкі, лексічныя, лексіка-граматычныя, арфаграфічныя і пунктуацыйныя ўменні і навыкі);

маўленчыя ўменні і навыкі (уменні і навыкі ў розных відах маўленчай дзейнасці: аўдзіраванні, чытанні, гаварэнні, пісьмовым маўленні);

камунікатыўныя ўменні і навыкі (уменні і навыкі выкарыстання розных відаў маўленчай дзейнасці ў пэўных маўленчых сітуацыях);

традыцыйны маўленчы этыкет, нормы маўленчых паводзін у розных сітуацыях зносін;

агульныя звесткі пра беларускую мову, формы яе існавання і сферы ўжывання, культурную і эстэтычную самакаштоўнасць беларускай мовы.

Сістэма развіцця маўлення скіравана на авалоданне рознымі відамі маўленчай дзейнасці, фарміраванне ў навучэнцаў здольнасці разумець праслуханае ці прачытанае маўленчае паведамленне на беларускай мове, ствараць вуснае выказванне на беларускай мове для задавальнення камунікатыўнага намеру, паступовае авалоданне пісьмовым маўленнем. Для дасягнення пастаўленай мэты змест сістэмы развіцця маўлення прадстаўлены ў трох кірунках: фарміраванне правільнага ўспрымання і разумення беларускай мовы пры слуханні і чытанні; фарміраванне ўменняў гаварэння; фарміраванне ўменняў пісьмовага маўлення.

Змест вучэбнага прадмета «Беларуская мова» структураваны па раздзелах: «Паўтарэнне», «Тэкст», «Сказ», «Слова» (тэмы «Значэнне слова», «Склад слова», «Часціны мовы»), «Паўтарэнне». На працягу ўсяго перыяду навучання праводзіцца навучанне каліграфіі.

8. Асноўная задача навучання каліграфіі – удасканаленне ў навучэнцаў уменняў і навыкаў плаўнага, правільнага, прыгожага і хуткага пісьма. У III–IV класах практыкаванні па каліграфіі выконваюцца па меры неабходнасці з мэтай прывучэння да рытмічнага пісьма. На іх адводзіцца спецыяльны час на ўроку. Заданні дыферэнцыруюцца з улікам каліграфічных недахопаў кожнага з навучэнцаў. Змест працы па каліграфіі па магчымасці звязваецца з фанетычным, лексічным ці граматычным матэрыялам, які вывучаецца на ўроку.

## ГЛАВА 2
## ЗМЕСТ ВУЧЭБНАГА ПРАДМЕТА Ў III КЛАСЕ. АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ НАВУЧЭНЦАЎ

(87 гадзін)

### ПАЎТАРЭННЕ (5 гадзін)

Гукі мовы, іх абазначэнне на пісьме літарамі. Вымаўленне і правапіс слоў з ў. Вымаўленне галосных [о], [э] – [а]. Правапіс літар о, э – а; е, ё – я. Вымаўленне і правапіс слоў з гукамі [д] – [дз’], [т] – [ц’], зацвярдзелымі, падоўжанымі зычнымі. Правапіс слоў з раздзяляльным мяккім знакам і апострафам.

## ТЭКСТ (6 гадзін)

Асноўная думка тэксту. Спосабы выказвання асноўнай думкі ў тэксце: выражэнне асноўнай думкі тэксту адным з яго сказаў або загалоўкам.

План тэксту. Складанне плана тэксту з пытальных і апавядальных сказаў.

Віды дзейнасці. Складанне тэксту са сказаў. Слуханне тэксту, адказы на пытанні па змесце. Вызначэнне і фармулёўка тэмы і асноўнай думкі тэксту. Выбар і выкарыстанне моўных сродкаў для выказвання думкі ва ўласным тэксце. Прагназаванне зместу тэксту па назве і малюнках да яго. Суаднясенне назвы з тэмай тэксту, асноўнай думкай тэксту. Аднаўленне дэфармаванага тэксту. Падбор загалоўка да тэксту. Падзел тэксту на часткі і складанне плана. Вусны і пісьмовы падрабязны пераказ невялікага апавядальнага тэксту па калектыўна складзеным плане. Вуснае паведамленне на зададзеную тэму па апорных словах, падабраных самастойна з дапамогай слоўніка. Сачыненне па серыі малюнкаў і калектыўна складзеным плане.

Навучальная пісьмовая работа (пераказ, 1 гадзіна).

## АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ НАВУЧЭНЦАЎ

Ведаць:

спосабы выражэння асноўнай думкі ў тэксце;

ролю плана пры стварэнні тэксту.

Умець (валодаць спосабамі пазнавальнай дзейнасці):

вызначаць тэму і фармуляваць асноўную думку тэксту;

пад кіраўніцтвам педагагічнага работніка складаць план гатовага тэксту або самастойнага выказвання;

падрабязна пераказваць змест праслуханага тэксту (аб'ёмам не больш за 70 слоў) у вуснай і пісьмовай форме па калектыўна складзеным плане;

выбарачна пераказваць змест праслуханага тэксту ў вуснай форме.

Выкарыстоўваць набытыя веды і ўменні ў практычнай дзейнасці і паўсядзённым жыцці:

ствараць нескладаныя маналагічныя выказванні па плане на даступныя навучэнцам тэмы (пра свае захапленні; добрыя ўчынкі; пра краіну; горад (вёску), у якіх яны жывуць; пра прыроду роднага краю).

## СКАЗ (14 гадзін)

Сказы апавядальныя, пытальныя, пабуджальныя. Інтанацыя сказа. Знакі прыпынку ў канцы сказаў. Асаблівасці клічных сказаў.

Галоўныя і даданыя члены сказа. Дзейнік і выказнік – галоўныя члены сказа (агульнае паняцце).

Вызначэнне сувязі слоў у сказе (словазлучэнняў). Даданыя члены сказа (без падзелу на віды). Даданыя члены сказа, якія звязаны з дзейнікам. Даданыя члены сказа, якія звязаны з выказнікам.

Віды дзейнасці. Вызначэнне меж сказаў у тэксце. Знаходжанне сказаў сярод прапанаваных спалучэнняў і груп слоў. Распазнаванне апавядальных, пытальных, пабуджальных, клічных сказаў у тэксце на слых. Пабудова сказаў, розных па мэце выказвання і інтанацыі. Складанне сказаў з прапанаваных слоў па малюнку. Сінтаксічны разбор сказаў. Суаднясенне сказаў з іх схемамі. Графічнае вылучэнне ў сказе граматычнай асновы. Знаходжанне слоў, якія пашыраюць граматычную аснову сказа. Развіццё сказаў даданымі членамі па пытаннях, малюнках. Вуснае апавяданне па малюнку або серыі малюнкаў і апорных словах, прапанаваных педагагічным работнікам. Выбар з тэксту і пераказ той яго часткі, якая адпавядае пастаўленаму пытанню (выбарачны пераказ). Слуханне тэксту, падзел на сэнсавыя часткі, вусны пераказ адной сэнсавай часткі.

## АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ НАВУЧЭНЦАЎ

Ведаць:

адрозненні паміж апавядальнымі, пытальнымі і пабуджальнымі сказамі;

асаблівасці клічных сказаў;

правілы пастаноўкі знакаў прыпынку ў канцы сказа;

прыметы галоўных і даданых членаў сказа.

Умець (валодаць спосабамі пазнавальнай дзейнасці):

аналізаваць і коратка характарызаваць сказы ў адпаведнасці з вывучанымі прыметамі;

правільна інтанаваць апавядальныя, пытальныя, пабуджальныя, клічныя сказы;

ставіць знакі прыпынку ў канцы апавядальных, пытальных і клічных сказаў;

вызначаць галоўныя і даданыя члены сказа;

вызначаць сувязь слоў у сказе (словазлучэнні) па пытаннях.

Выкарыстоўваць набытыя веды і ўменні ў практычнай дзейнасці і паўсядзённым жыцці:

удзельнічаць у дыялогах на даступныя навучэнцам тэмы: выкарыстоўваць сказы розных тыпаў, адэкватна перадаваць эмоцыі, захоўваць неабходную інтанацыю ў межах сказа.

## СЛОВА (56 гадзін)

### Значэнне слова (7 гадзін)

Значэнне слова. Адназначныя і мнагазначныя словы. Прамое і пераноснае значэнне слова. Словы з блізкім значэннем (сінонімы). Словы, якія маюць супрацьлеглае значэнне (антонімы).

Знаёмства на практычным узроўні з выпадкамі міжмоўнай аманіміі ў беларускай і рускай мовах (без увядзення тэрміна).

Віды дзейнасці. Суаднясенне прадмета на малюнку са словам і значэннем слова. Тлумачэнне значэнняў слоў з улікам іх будовы. Называнне слова па яго лексічным значэнні. Вылучэнне адназначных і мнагазначных слоў. Вызначэнне прамога і пераноснага значэння мнагазначных слоў. Падбор сінонімаў. Падбор антонімаў. Вуснае паведамленне на прапанаваную тэму з ужываннем слоў з блізкім і супрацьлеглым значэннем. Складанне сказаў з мнагазначнымі словамі ў прамым і пераносным значэнні, з міжмоўнымі амонімамі. Высвятленне значэння слова пры дапамозе тлумачальнага слоўніка.

Навучальная пісьмовая работа (сачыненне, 1 гадзіна).

### Склад слова

### (22 гадзіны, з іх 1 гадзіна – кантрольны дыктант)

Роднасныя (аднакаранёвыя) словы. Корань як агульная частка аднакаранёвых слоў. Падбор аднакаранёвых слоў і абазначэнне кораня.

Канчатак як частка слова. Роля канчатка ў змяненні слова. Канчатак як сродак сувязі слоў у сказе. Агульнае паняцце пра нулявы канчатак. Вызначэнне і абазначэнне канчатка слова (у тым ліку і нулявога).

Прыстаўка як частка слова. Правапіс прыставак аб-, ад-, над-, пад-, з- (с-). Правапіс прыставак, якія заканчваюцца на з, с (раз-(рас-), без-(бес-), уз-(ус-)). Адрозненне прыставак ад прыназоўнікаў. Апостраф у словах з прыстаўкамі. Падваенне зычных на стыку прыстаўкі і кораня.

Суфікс як частка слова. Роля суфіксаў ва ўтварэнні слоў. Падваенне зычных на стыку кораня і суфікса.

Віды дзейнасці. Знаходжанне сярод прапанаваных слоў роднасных. Тлумачэнне правапісу галосных у каранях слоў. Падбор праверачных

аднакаранёвых слоў да прапанаваных. Вылучэнне прыстаўкі і кораня ў словах, вызначэнне апошняга зычнага прыстаўкі, першага зычнага кораня. Утварэнне слоў з новым значэннем пры дапамозе прыставак. Вызначэнне і абазначэнне прыставак у словах. Вызначэнне і абазначэнне суфіксаў у словах. Складанне тэксту з ужываннем роднасных слоў, прапанаваных педагагічным работнікам. Знаходжанне ў тэкстах слоў з суфіксамі суб'ектыўнай ацэнкі (памяншальна-ласкальнымі, павелічальнымі). Развіццё сказаў у тэксце патрэбнымі па сэнсе словамі з сінанімічнымі, антанімічнымі прыстаўкамі. Сачыненне па малюнку і калектыўна складзеным плане.

Навучальная пісьмовая работа (сачыненне, 1 гадзіна).

Часціны мовы (27 гадзін, з іх 1 гадзіна – кантрольны дыктант з дадатковым заданнем)

Агульнае паняцце пра самастойныя і службовыя часціны мовы (на практычным узроўні). Роля прыназоўнікаў у сказе.

Назоўнік як часціна мовы. Знаёмства з адушаўлёнымі і неадушаўлёнымі назоўнікамі (на практычным узроўні). Адзіночны і множны лік назоўнікаў. Мужчынскі, жаночы і ніякі род назоўнікаў. Назоўнікі, род і лік якіх не супадаюць у беларускай і рускай мовах. Змяненне назоўнікаў у сказе па пытаннях.

Прыметнік як часціна мовы. Сувязь прыметніка з назоўнікам у сказе. Змяненне прыметнікаў па родах і ліках у залежнасці ад назоўнікаў, з якімі яны звязаны.

Дзеяслоў як часціна мовы. Адзіночны і множны лік дзеясловаў. Цяперашні, прошлы і будучы час дзеясловаў. Змяненне дзеясловаў прошлага часу па родах і ліках. Адрозненне націску ў граматычных формах дзеясловаў у рускай і беларускай мовах. Правапіс не з дзеясловамі.

Віды дзейнасці. Распазнаванне назоўнікаў, прыметнікаў, дзеясловаў, вызначэнне іх ролі ў сказах і тэкстах. Утварэнне форм адзіночнага і множнага ліку назоўнікаў. Вызначэнне роду назоўнікаў пры дапамозе слоў ён, мой; яна, мая; яно, маё. Вызначэнне ліку і роду прыметнікаў. Утварэнне розных форм ліку і роду прыметнікаў. Утварэнне розных форм ліку і часу дзеясловаў. Развіццё сказаў у тэксце патрэбнымі па сэнсе назоўнікамі, прыметнікамі, дзеясловамі. Знаходжанне ў тэксце назоўнікаў, прыметнікаў пэўнага роду і ліку. Пашырэнне сказаў назоўнікамі і прыметнікамі ў патрэбнай форме. Знаходжанне ў тэксце дзеясловаў пэўнага часу і ліку. Змяненне часу дзеясловаў у сказе. Падзел праслуханага тэксту на сэнсавыя часткі, вусны пераказ па сэнсавых частках. Пісьмовы пераказ тэксту па калектыўна складзеным плане.

Навучальная пісьмовая работа (пераказ, 1 гадзіна).

## АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ НАВУЧЭНЦАЎ

Ведаць:

пра ўжыванне слоў у прамым і пераносным значэнні;

прыметы сінонімаў, антонімаў;

часткі слова (канчатак, корань, суфікс, прыстаўка), іх ролю ў слове;

прыметы аднакаранёвых слоў;

ролю канчатка ў слове;

правапіс падвоеных зычных на стыку прыстаўкі і кораня, кораня і суфікса;

правапіс прыставак аб-, ад-, над-, пад-, з-(с-), раз-(рас-), без-(бес-), уз-(ус-);

правапіс апострафа ў словах з прыстаўкамі;

асноўныя лексіка-граматычныя прыметы назоўніка, прыметніка, дзеяслова;

пра назоўнікі, род і лік якіх не супадае ў рускай і беларускай мовах;

правапіс не з дзеясловамі.

Умець (валодаць спосабамі пазнавальнай дзейнасці):

вызначаць прамое і пераноснае значэнне слова ў сказе;

адрозніваць і параўноўваць словы блізкія і супрацьлеглыя па значэнні, мнагазначныя словы;

выкарыстоўваць сінонімы, антонімы, мнагазначныя словы ў патрэбным значэнні ў маўленні;

аналізаваць і коратка характарызаваць склад слоў выразнай будовы;

падбіраць аднакаранёвыя словы;

правільна пісаць словы з падвоенымі зычнымі на стыку прыстаўкі і кораня, кораня і суфікса;

правільна пісаць словы з прыстаўкамі аб-, ад-, над-, пад-, з-(с-), раз-(рас-), без-(бес-), уз-(ус-);

правільна пісаць словы з апострафам пасля прыставак;

змяняць назоўнікі па ліках, вызначаць род і лік назоўнікаў;

змяняць прыметнікі па родах і ліках, вызначаць род і лік прыметнікаў;

дапасоўваць прыметнікі да назоўнікаў у патрэбнай форме пры складанні ўласных сказаў і тэкстаў;

змяняць дзеясловы па ліках і часах, змяняць дзеясловы прошлага часу па родах;

вызначаць час, лік дзеясловаў, род дзеясловаў прошлага часу;

спалучаць назоўнікі з дзеясловамі пры складанні ўласных сказаў і тэкстаў;

пісаць не з дзеясловамі.

Выкарыстоўваць набытыя веды і ўменні ў практычнай дзейнасці і паўсядзённым жыцці:

ужываць ветлівыя словы і звароты ў зносінах з гасцямі школы, з незнаёмымі людзьмі ў магазіне, транспарце, бібліятэцы, на пошце;

захоўваць вывучаныя нормы арфаграфіі пры выкананні пісьмовых заданняў і ўласных запісаў (запіска, віншаванне, перапіска з сябрамі, сваякамі, запрашэнне).

### ПАЎТАРЭННЕ (5 гадзін)

Рэзервовыя гадзіны – 1.

## ГЛАВА 3
## ЗМЕСТ ВУЧЭБНАГА ПРАДМЕТА Ў IV КЛАСЕ. АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ НАВУЧЭНЦАЎ

(87 гадзін)

### ПАЎТАРЭННЕ (4 гадзіны)

Аднастайнае напісанне кораня ў аднакаранёвых словах. Правапіс прыставак. Падваенне зычных на стыку прыстаўкі і кораня, кораня і суфікса. Лік і род назоўнікаў. Змяненне прыметнікаў па родах і ліках. Лік і час дзеясловаў.

### ТЭКСТ (7 гадзін)

Сувязь сказаў у тэксце. Сродкі сувязі сказаў у тэксце: лексічныя паўторы, сінонімы, антонімы, выкарыстанне слоў ён, яна, яно, яны, гэты, той, там, так, адзінства часавых форм дзеясловаў.

Тыпы тэксту: апавяданне, апісанне, разважанне. Перадача паслядоўнасці падзей у апавядальных тэкстах. Будова тэксту-апавядання. Паведамленне аб прыметах прадмета ў апісальных тэкстах. Будова тэксту-апісання. Выказванне і доказ думкі ў разважаннях. Будова тэксту-разважання.

Вобразна-выяўленчыя сродкі мовы ў тэксце.

Віды дзейнасці. Складанне тэксту-апавядання, апісання, разважання на вызначаную тэму з дапамогай апорных слоў. Складанне плана тэксту.

Вызначэнне асноўнай думкі тэксту. Падбор загалоўка да тэксту. Пашырэнне гатовага тэксту вобразна-выяўленчымі сродкамі. Рэдагаванне тэксту: замена слоў, якія паўтараюцца, займеннікамі. Аргументаванае вызначэнне тыпу тэксту. Падзел на сэнсавыя часткі, складанне плана і вусны пераказ прачытанага тэксту. Падзел на сэнсавыя часткі праслуханага тэксту. Выбар з тэксту асноўнага зместу і вусны пераказ яго (сціслы пераказ).

Навучальная пісьмовая работа (пераказ, 1 гадзіна).

## АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ НАВУЧЭНЦАЎ

Ведаць:

сродкі сувязі сказаў у тэксце;

асаблівасці тэкстаў розных тыпаў (апавяданне, апісанне, разважанне), іх будову.

Умець (валодаць спосабамі пазнавальнай дзейнасці):

знаходзіць сродкі сувязі сказаў у тэксце;

адрозніваць тэкст-апавяданне, тэкст-апісанне і тэкст-разважанне;

вызначаць структурныя часткі тэкстаў розных тыпаў;

падрабязна пераказваць вусна і пісьмова па плане змест праслуханага і прачытанага тэксту (аб’ёмам не больш за 90 слоў);

сцісла пераказваць у вуснай форме змест праслуханага і прачытанага тэксту.

Выкарыстоўваць набытыя веды і ўменні ў практычнай дзейнасці і паўсядзённым жыцці:

ужываць ветлівыя словы і звароты ў зносінах з людзьмі па тэлефоне;

ствараць нескладаныя маналагічныя выказванні ў выглядзе апавядання, апісання або разважання на даступныя навучэнцам тэмы (пра свае прыгоды, любімыя кнігі, гісторыю сваёй краіны, змены ў прыродзе роднага краю, прафесіі людзей).

## СКАЗ (10 гадзін)

Сказы з аднароднымі членамі (дзейнікамі, выказнікамі, даданымі членамі). Сродкі сувязі аднародных членаў сказа: інтанацыя, злучнікі і, а, але. Знакі прыпынку ў сказах з аднароднымі членамі.

Віды дзейнасці. Пашырэнне сказаў аднароднымі членамі, дапаўненне тэксту сказамі з аднароднымі членамі. Вызначэнне галоўных і даданых аднародных членаў сказа. Вызначэнне ролі злучнікаў у сказах з

аднароднымі членамі сказа. Пастаноўка знакаў прыпынку ў сказах з аднароднымі членамі. Вызначэнне сказаў з аднароднымі членамі ў праслуханым і прачытаным тэксце. Пісьмовы пераказ прачытанага тэксту па калектыўна складзеным плане. Складанне вуснага выказвання на вызначаную тэму па плане і апорных словах, прапанаваных педагагічным работнікам.

Навучальная пісьмовая работа (сачыненне, 1 гадзіна).

## АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ НАВУЧЭНЦАЎ

Ведаць:
прыметы аднародных членаў сказа;
сродкі сувязі аднародных членаў у сказе;
правілы пастаноўкі знакаў прыпынку ў сказах з аднароднымі членамі.

Умець (валодаць спосабамі пазнавальнай дзейнасці):
правільна інтанаваць сказы з аднароднымі членамі;
вызначаць сродкі сувязі аднародных членаў у сказе (інтанацыя, злучнікі і, а, але);
ставіць знакі прыпынку ў сказах з аднароднымі членамі.

Выкарыстоўваць набытыя веды і ўменні ў практычнай дзейнасці і паўсядзённым жыцці:
удзельнічаць у дыялогах на даступныя навучэнцам тэмы: выкарыстоўваць сказы з аднароднымі членамі, адэкватна перадаючы эмоцыі і захоўваючы інтанацыю аднароднасці ў межах сказа.

## СЛОВА (60 гадзін)

### Склад слова (2 гадзіны)

Часткі слова. Аснова слова як частка слова без канчатка.

Віды дзейнасці. Вызначэнне ў словах кораня, прыстаўкі, суфікса, канчатка, асновы слова. Утварэнне форм аднаго і таго ж слова з дапамогай канчатка. Спалучэнне слоў у сказе шляхам замены канчатка. Вызначэнне асновы слова на слых. Вызначэнне апошняга гука асновы. Складанне сказаў з формамі аднаго і таго ж слова. Сачыненне па ўласных назіраннях па калектыўна складзеным плане.

### Часціны мовы (58 гадзін)

#### Назоўнік
(23 гадзіны, з іх 1 гадзіна – кантрольны дыктант)

Назоўнік як часціна мовы. Скланенне назоўнікаў. Назвы склонаў і склонавыя пытанні. 1, 2, 3-е скланенне назоўнікаў.

Азнаямленне з напісаннем склонавых канчаткаў назоўнікаў 1-га, 2-га, 3-га скланення (з апорай на табліцы).

Скланенне назоўнікаў множнага ліку. Азнаямленне з напісаннем склонавых канчаткаў назоўнікаў множнага ліку (з апорай на табліцы). Адрозненне месца націску ў граматычных формах назоўнікаў у рускай і беларускай мовах.

Віды дзейнасці. Знаходжанне ў тэксце назоўнікаў, якія адказваюць на пытанні хто? што? Вызначэнне склону назоўнікаў. Утварэнне склонавых форм назоўнікаў. Практыкаванні ў напісанні склонавых канчаткаў назоўнікаў 1-га, 2-га і 3-га скланення (з апорай на табліцы). Спалучэнне назоўнікаў з іншымі словамі ў сказе шляхам змянення канчатка. Развіццё сказаў назоўнікамі ў патрэбнай форме. Вызначэнне на слых памылак у спалучальнасці назоўнікаў з іншымі словамі ў сказах. Развіццё сказаў у тэксце блізкімі, супрацьлеглымі па значэнні назоўнікамі ў розных склонах.

## Прыметнік (12 гадзін)

Прыметнік як часціна мовы. Змяненне прыметнікаў па ліках, родах у залежнасці ад назоўнікаў, з якімі яны звязаны ў сказе.

Змяненне прыметнікаў адзіночнага і множнага ліку па склонах у залежнасці ад назоўнікаў, з якімі яны звязаны ў сказе.

Скланенне прыметнікаў мужчынскага і ніякага роду, азнаямленне з правапісам іх склонавых канчаткаў.

Скланенне прыметнікаў жаночага роду, азнаямленне з правапісам іх склонавых канчаткаў.

Скланенне прыметнікаў множнага ліку, азнаямленне з правапісам іх склонавых канчаткаў.

Адрозненне месца націску ў граматычных формах прыметнікаў у рускай і беларускай мовах.

Віды дзейнасці. Вызначэнне ліку, роду і склону прыметнікаў, вылучэнне іх канчаткаў. Утварэнне склонавых форм прыметнікаў адзіночнага і множнага ліку (з апорай на табліцы). Спалучэнне прыметнікаў з назоўнікамі ў сказе шляхам змянення канчаткаў. Развіццё сказаў прыметнікамі ў патрэбнай форме. Развіццё сказаў у тэксце блізкімі, супрацьлеглымі па значэнні прыметнікамі. Пашырэнне гатовага тэксту вобразна-выяўленчымі сродкамі. Вызначэнне на слых памылак у спалучальнасці слоў у сказах. Вуснае сачыненне па ўласных назіраннях па калектыўна складзеным плане.

Навучальная пісьмовая работа (сачыненне, 1 гадзіна).

### Займеннік (5 гадзін)

Агульнае паняцце пра займеннік як часціну мовы. Асабовыя займеннікі. Асабовыя займеннікі адзіночнага і множнага ліку. Род асабовых займеннікаў. Змяненне асабовых займеннікаў па склонах.

Правапіс прыназоўнікаў з займеннікамі.

Віды дзейнасці. Вызначэнне асобы, ліку, склону асабовых займеннікаў. Утварэнне склонавых форм асабовых займеннікаў (з апорай на табліцы). Напісанне асабовых займеннікаў з прыназоўнікамі. Спалучэнне асабовых займеннікаў з іншымі словамі ў сказе шляхам змянення канчаткаў. Развіццё сказаў займеннікамі ў патрэбнай форме. Вызначэнне на слых памылак у спалучальнасці слоў у сказах. Рэдагаванне тэксту: замена слоў, якія паўтараюцца, асабовымі займеннікамі.

### Дзеяслоў

(18 гадзін, з іх 1 гадзіна – кантрольны дыктант з дадатковым заданнем)

Дзеяслоў як часціна мовы. Змяненне дзеясловаў па ліках і часах. Змяненне дзеясловаў прошлага часу па родах. Суфіксы дзеясловаў прошлага часу.

Неазначальная форма дзеяслова. Суфіксы дзеясловаў у неазначальнай форме. Правапіс дзеясловаў на -ся, -цца.

Асоба дзеяслова. Змяненне дзеясловаў цяперашняга і будучага часу па асобах і ліках (спражэнне). Тыпы спражэння дзеясловаў. Канчаткі дзеясловаў I і II спражэння.

Адрозненне месца націску ў граматычных формах дзеясловаў у рускай і беларускай мовах.

Віды дзейнасці. Знаходжанне дзеясловаў у тэксце, пастаноўка пытанняў да дзеясловаў. Вызначэнне часу, ліку і роду дзеясловаў. Вылучэнне неазначальнай формы дзеясловаў з апорай на суфіксы неазначальнай формы. Утварэнне асабовых форм дзеясловаў цяперашняга і простага будучага часу I і II спражэння (з апорай на табліцы). Спалучэнне дзеясловаў з іншымі словамі ў сказе шляхам змянення канчаткаў. Змяненне часу дзеясловаў у тэксце. Развіццё сказаў у тэксце блізкімі, супрацьлеглымі па значэнні дзеясловамі. Пашырэнне гатовага тэксту вобразна-выяўленчымі сродкамі. Вызначэнне на слых памылак у спалучальнасці слоў у сказах. Вусны пераказ прачытанага тэксту па самастойна складзеным плане.

Навучальная пісьмовая работа (пераказ, 1 гадзіна).

## АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ НАВУЧЭНЦАЎ

Ведаць:

назвы склонаў і склонавыя пытанні;

спосабы вызначэння склону назоўнікаў і прыметнікаў;

асаблівасці змянення назоўнікаў адзіночнага ліку 1-га, 2-га, 3-га скланення і назоўнікаў множнага ліку;

асаблівасці змянення прыметнікаў адзіночнага ліку жаночага роду, асаблівасці змянення прыметнікаў адзіночнага ліку мужчынскага і ніякага роду, асаблівасці змянення прыметнікаў множнага ліку;

асабовыя займеннікі, іх асобу і лік;

асаблівасці змянення асабовых займеннікаў па склонах;

прыметы дзеясловаў у неазначальнай форме;

спосаб вызначэння асобы і ліку дзеясловаў;

правапіс дзеясловаў на -ся, -цца.

Умець (валодаць спосабамі пазнавальнай дзейнасці):

вызначаць канчатак, аснову, корань, суфікс, прыстаўку ў словах выразнай будовы;

распазнаваць у тэкстах назоўнікі, прыметнікі, асабовыя займеннікі, дзеясловы, прыназоўнікі;

змяняць назоўнікі, прыметнікі, асабовыя займеннікі па склонах (з апорай на табліцы);

вызначаць склон назоўнікаў, прыметнікаў, асабовых займеннікаў і іх склонавыя пытанні (з апорай на табліцы);

выкарыстоўваць назоўнікі, прыметнікі ў патрэбных склонавых формах пры складанні ўласных сказаў і тэкстаў;

вызначаць асобу і лік асабовых займеннікаў;

адрозніваць неазначальную форму дзеяслова;

утвараць формы прошлага часу дзеясловаў пры дапамозе суфіксаў -ў-, -л-;

утвараць асабовыя формы дзеясловаў (з апорай на табліцы);

вызначаць асобу, лік дзеясловаў цяперашняга і будучага часу, іх канчаткі (з апорай на табліцы);

выкарыстоўваць дзеясловы ў патрэбных формах часу; ліку, асобы (у цяперашнім і будучым часе), роду (у прошлым часе); дзеясловы ў неазначальнай форме пры складанні ўласных сказаў і тэкстаў;

выкарыстоўваць асабовыя займеннікі ў патрэбных склонавых формах ва ўласных тэкстах.

Выкарыстоўваць набытыя веды і ўменні ў практычнай дзейнасці і паўсядзённым жыцці:

захоўваць вывучаныя нормы арфаграфіі пры выкананні пісьмовых заданняў і ўласных запісаў (запіска, віншаванне, перапіска з сябрамі, сваякамі, запрашэнне, аб'ява, пісьмо ў дзіцячы часопіс, у дзіцячую перадачу на радыё, тэлебачанне).

ПАЎТАРЭННЕ (3 гадзіны)

Рэзервовыя гадзіны – 3.